**МІХА́ЙЛА**, М і х а л, прысвятак у гонар архістраціга Міхаіла, які адзначаецца 21 лістапада (н.ст.). Апошняе свята года: «Міхайла — усім святкам запіхайла». Гэты дзень прыходзіў, як спявалі ў песні, «з халодным вятром». Нездарма яго называлі «Міхал-страхадзёр», бо шалёны вецер мог нават пазрываць стрэхі. На Усходнім Палессі гэты дзень святкавалі, абмяжоўваючыся ў пэўных справах: не секлі сякераю, не рэзалі нажом, не пралі, каб не пакрыўдзіўся М. і каб гром не пабіў, паколькі М. ўспрымаўся як абаронца ад грому. У Рэчыцкім павеце напярэдадні Міхайлавага дня праводзіліся памінанні нябожчыкаў. Палявыя работы даўно былі закончаныя, што адзначалася ў прыказцы: «Прыйшоў Міхал — усіх з поля паспіхаў». Адштурхоўваючыся ад асаблівасцей дня М., нар. метэаралогія давала прадказанні надвор'я на інш. дні календара: «Калі на Міхайлаў дзень сціснець (мароз), то ў Міколаў дзень (19 снежня н.ст.) адпусціць»; «Калі Міхайла ў снягу, то і Пасха ў снягу, а як не, дык і не».

*Літ.*: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 2. Жыцця адвечны лад. Мн., 1998. С. 549—550.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ